# РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
# Ў ДУХОЎНЫМ РАЗВІЦЦІ НАРОДА

**Цывілька Алена Уладзіміраўна**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі "Макранскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад-сярэдняя школа"

Мова з'яўляецца найважнейшым сродкам зносін паміж людзьмі. Мову стварыў народ, ён яе і папаўняе новымі словамі. Дзякуючы мове развіваюцца ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Мова – гэта не проста сродак зносін, гэта неацэнная спадчына, найкаштоўнейшы набытак любога народа. Надзвычай важную ролю мова адыгрывае ў духоўным развіцці народа. Дык чаму ж тады ў нашай краіне сітуацыя з беларускай мовай складаная?

Для нас, сучасных беларусаў, беларуская мова выконвае аб'ядноўваючую ролю. У цэтральнай Беларусі можна сустрэць людзей, якія размаўляюць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

толькі па-беларуску, а ў горадзе пераважае руская мова. Часта даводзіцца чуць і такія меркаванні, што беларуская мова непрыгожая, гэта мова вёскі, навошта гаварыць па-беларуску, калі можна гаварыць па-руску. Крыўдна, бо нашы дзяды, прадзеды, прапрадзеды пакінулі нам у спадчыну іменна беларускую мову. У нашай краіне існуе білінгвізм: дзяржаўнымі з’яўляюцца беларуская і руская мовы. Між іншым, білінгвізм даволі распаўсюджаны ў свеце: у Канадзе, Швейцарыі, Бельгіі, Нарвегіі, Фінляндыі. У сітуацыі білінгвізму сталася так, што рускую мову сталі лічыць роднай мільёны беларусаў.

Часта ўспамінаецца выпадак з жыцця Максіма Багдановіча, беларускага паэта пачатку ХХ стагоддзя. Калі ён вучыўся ў Яраслаўскай гімназіі, аднойчы на лекцыі па гісторыі, гаворачы пра народы заходняй ускраіны Расійскай імперыі, выкладчык не назваў Беларусь. У Максіма Багдановіча ўзнікла пытанне: “А беларусы?” А выкладчык здзекліва перапытаў: “Якія яшчэ беларусы?”. Пісьменнік адказаў: “Што жывуць у Беларусі”. Выкладчык не здаваўся: “Калі ёсць беларуская нацыя, дык у яе павінна быць і мова, і культура. Дзе яны?” Тады паэт устаў і на прыгожай беларускай мове прачытаў свой верш “Зімой”. Калі Багдановіч скончыў, пачуліся гучныя воплескі. Выкладчык сказаў, што бярэ назад свае словы. Максім Багдановіч, зорка беларускай паэзіі, сваім вершам здолеў даказаць упартаму выкладчыку існаванне беларускай мовы, беларускай культуры, беларускай нацыі. І вось зараз наша мова заяўляе, нават патрабуе свае права на існаванне.

Беларуская мова не менш багатая, чым руская. На яе перакладзена шмат твораў самых разнастайных стыляў і жанраў. Пераклад Аркадзем Куляшовым пушкінскага рамана “Яўгеній Анегін” літаратурныя крытыкі называюць лепшым за арыгінал.

Беларусы добра ведаюць звесткі з гісторыі нашай Радзімы, што толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім беларуская мова была дзяржаўнай. А гэта значыць, што яна выкарыстоўвалася ў справаводстве, палітыцы, дыпламатыі, у перапісцы. У гэты перыяд на беларускую мову перакладаліся мастацкія і публіцыстычныя творы, пісаліся гістарычныя хронікі.

У выніку Люблінскай уніі Вялікае **Княства** Літоўскае і **Каралеўства Польскае** аб’ядналіся ў адну дзяржаву пад назвай **Рэч Паспалітая**. У 1696 годзе быў прыняты закон, паводле якога на тэрыторыі, што раней належала да Вялікага Княства Літоўскага, дзяржаўнай становіцца польская мова. Гэта прывяло да зніжэння ролі літоўскай (беларускай) мовы, паколькі яна не выкарыстоўвалася ў афіцыйна-справавым аспекце жыцця літоўскага (беларускага) народа Рэчы Паспалітай. З гэтай прычыны яна пачала выходзіць з паўсядзённага ўжытку і замяняцца польскай мовай, бо на дзяржаўным узроўні яна страціла запатрабаванасць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У выніку гэтага літоўская (беларуская) мова пачала выжываць, яе асноўным носбітам і захавальнікам стаў народ – галоўным чынам сялянства, якое ў той час з'яўлялася большая часткай грамадства. Можна сказаць, што менавіта сялянства і захавала нашу мову і культуру.

У выніку распаду Рэчы Паспалітай, уканцы XVIII стагоддзя тэрыторыя былога Вялікага Княства Літоўскага ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі, што прывяло нават да забароны называць народ "літоўцы, ліцвіны" і насаджэнні назвы ліцвінаў як "беларусы" загадам Аляксандра II. Яшчэ з часоў Кацярыны II Маскоўскім патрыярхатам, установамі адукацыі праводзілася агрэсіўная палітыка абрусення ліцвінаў. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гадоў пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўстанавілі ваенна-паліцэйскі рэжым: забаранілі друкаваць, прывозіць, выкарыстоўваць і захоўваць літаратуру на роднай мове. Выключэнне рабілася толькі для фальклорных і гістарычных твораў і помнікаў.

Але ліцвінская (беларуская) мова дайшла да нас, нягледзячы на такія жорсткія ўмовы выжывання, дзякуючы таму, што развіццё яе як сродку зносін і нават як мовы мастацкай і публіцыстычнай літаратуры не спынялася дзякуючы патрыётам і народу, якому яна была роднай.

У выніку буржуазнай рэвалюцыі і кастрычніцкага перавароту 1917 года, абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе, барацьбы нашага народа з бальшавікамі праз паўстанні ў 1918–1920 гадах, падтрымкі міжнароднай супольнасці, бальшавікі дазволілі стварыць для (беларусаў) ліцвінаў рэспубліку па нацыянальнай прыкмеце. Пасля II Сусветнай вайны значныя часткі тэрыторыі БССР былі аддадзены Летуве (нават з гістарычнай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага – Вільняй), Польшчы (Беласточчына), РСФСР (Смаленская, Бранская вобласці, частка Пскоўскай вабласці). Беларуская (ліцвінская) мова атрымала магутны штуршок да далейшага развіцця і зноў стала адной з самых магутных моў свету – у яе складзе больш за 210 000 слоў. Для параўнання: у рускай мове слоў каля 120 000.

На беларускай мове створаны помнікі літаратуры і культуры сусветнага значэння: паэму Я. Коласа "Новая зямля" вывучаюць ва ўсіх універсітэтах свету.

Наша літаратура шырока вядома ў свеце, творы нашых класікаў перакладзены на дзясяткі моў. Беларусь шырока заявіла аб сабе ў свеце як працалюбівая, спартыўная краіна. Яе ведаюць як плацдарм міру і захавання памяці ваеннага мінулага. Цывілізаваны чалавек павінен быць аб'ектыўным і чалавечным у адносінах да свайго народа і сваёй гістарычнай спадчыны, часцінкай якой з'яўляецца наша беларуская мова.

Задачы школы і настаўнікаў нашай роднай беларускай мовы і літаратуры – адраджаць духоўнасць праз павагу да беларускай мовы, захаваць беларускую



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мову ў вуснах нашай сучаснай моладзі, каб будучыя пакаленні не называлі сябе “тутэйшымі”. Вельмі хочацца, каб беларуская мова не трапіла ў групу мёртвых моў.

й архив библиотеки МГУ имени А.